# Акцэнт на захаванне культурнай спадчыны

**Нацыянальная бібліятэка Беларусі распачала цыкл публічных лекцый «Крыніцы гістарычнай памяці». Сустрэчы з вядомымі навукоўцамі ладзяцца штотыдзень у адкрытым фармаце ў зале адукацыйных тэхналогій. Кожная лекцыя будзе прысвечана знакавым падзеям мінулага.**

— Год гістарычнай памяці можа спрыяць большай папулярызацыі тых ці іншых крыніц, сярод іх — старажытныя рукапісы, архіўныя крыніцы, летапісы, падпольныя і партызанскія газеты, лістоўкі часоў Вялікай Айчыннай вайны, картаграфічныя, археалагічныя дакументы і інш. Такім чынам мы вырашылі выкарыстаць тэматыку Года гістарычнай памяці і асэнсаваць яе праз крыніцы, якія мы захоўваем, і весці актыўны і эфектыўны дыялог з чытачамі і калегамі, — падкрэсліў намеснік генеральнага дырэктара Нацыяльнальнай бібліятэкі Беларусі — дырэктар па навуковай рабоце і выдавецкай дзейнасці Аляксандр Суша.

Распачаў праграму сустрэч дырэктар Інстытута літаратуразнаўства імя Янкі Купалы Іван Саверчанка, які выступіў з лекцыяй «Беларуская літаратура эпохі Готыкі, Рэнесансу і Барока».

Падчас мерапрыемства былі абмеркаваны актуальныя пытанні развіцця беларускай літаратуры і літаратуразнаўства, крыніцазнаўства і медыялінгвістыкі. Удзельнікі сустрэчы пазнаёміліся з навуковымі выданнямі пра старабеларускую літаратуру XI—XVII стагоддзяў, каштоўнымі помнікамі і дасягненнямі нацыянальнага пісьменства. Іван Саверчанка зрабіў акцэнт на найбольш важных выданнях для вывучэння старажытнай беларускай літаратуры, адказаў на пытанні прысутных і прапанаваў топ найцікавейшых твораў па тэме лекцыі.

Гэты праект закліканы не толькі захаваць гістарычныя сведкі мінуўшчыны, але і зрабіць іх даступнымі для шырокай аўдыторыі. Экспертам наступнай сустрэчы стаў знакаміты гісторык, даследчык беларускіх летапісных крыніц Вячаслаў Чамярыцкі, які выступіў з лекцыяй «Беларускія летапісы і хронікі».

**Дзіяна КАЗІМІРЧЫК**